НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

*Беларусь,*
*твой народ*
*дачакаецца*
*Залацістага,*
*яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

**№ 9 (121), ЛІПЕНЬ 2011 ГОДА**

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## ПОГЛЯД РЭДАКТАРА

# П’ЯНЫМ НАРОДАМ ЛЯГЧЭЙ КІРАВАЦЬ

Нагодай для артыкула паслужыла дзікунскае здарэнне ў Паставах. Трагедыяй закончылася сумеснае распіццё піва паміж дзвюмя дзяўчынкамі. Малыя сядзелі дома адны і пілі піва “Крыніца моцнае”. Затым паміж імі ўзнікла сварка, і малодшая, якой было усяго адзінаццаць гадоў, некалькі разоў ударыла нажом старэйшую, дванаццацігадовую. Пацярпелую ўратаваць не ўдалося, яна памерла ў рэанімацыі. Як затым высветлілася, дзяўчынкі гадаваліся ў неблаганадзейных сем’ях. Тое, што адбылося ў Паставах – гэта ўжо за межамі чалавечага разумення. Дзіцячая панажоўшчына ў нецвярозым стане. Здаецца, каціцца далей ужо няма куды. Сёння прыкметы татальнай алкагалізацыі нашага грамадства навідавоку. І асабліва злаякасны – жаночы алкагалізм. Раніцою збіраюць бутэлькі і рыюцца ў сметніцах ужо не бабулькі, а жанчыны сярэдняга веку. У жанчын вельмі мабільная нервовая сістэма, і любыя непрыемнасці або стрэс проста выбіваюць яе з каляіны. Любая негатыўная дробязь выводзіць жанчыну з раўнавагі, і ей ужо ўсё роўна – што будзе, то будзе. Нарколагі сцвярджаюць, што яшчэ дваццаць гадоў таму жанчыны складалі ўсяго чатыры працэнты ад усіх пацыентаў. А сёння іх ужо каля дзесяці працэнтаў. Разам з тым падлеткі співаюцца яшчэ больш хуткімі тэмпамі. Штогод міліцыя затрымлівае ў нецвярозым выглядзе ў сярэднім 25 – 27 тысяч падлеткаў. Адпаведна расце колькасць цяжкіх злачынстваў, учыненых падлеткамі. За сем месяцаў гэтага года падлеткі прымалі ўдзел ва ўчыненні 40 забойстваў ( за аналагічны перыяд мінулага года на сумленні непаўналетніх былі 34 такія злачынствы). Летась зарэгістравана больш як за 120 выпадкаў суіцыду сярод непаўналетніх. На 70 працэнтаў павялічылася колькасць разбояў і хуліганстваў, учыненых непаўналетнімі. За паўгода ў нашай краіне было асуджана 2370 падлеткаў. Відавочна, што прычыны алкагалізацыі і крымінालізацыі падрастаючага пакалення найперш трэба шукаць у сям’і. Як, правіла, менавіта тыя сем’і, дзе бацькі не займаюцца выхаваннем дзяцей і увогуле не клапоцяцца пра іх, і з’яўляюцца своеасаблівай кузняй кадраў для крымінальнага асяроддзя. Гэтыя дзеці нярэдка з малых гадоў прызвычайваюцца да спіртовых напояў. Міліцыя карае бацькоў за спойванне дзяцей, але аднымі карнымі метадамі ўратаваць дзяцей ад п’янства немагчыма. У гэтым выпадку патрэбна мэтанакіраваная праца ўсяго грамадства. Але як грамадства можа ўратаваць дзяцей і бацькоў? Што разбэсціла інстытут сям’і і спаіла беларускі народ? Вядома што – гэта мэтанакіраваная палітыка дзяржавы. Па даных Белстата, у студзені-траўні гэтага года аб’ёмы рэалізацыі гарэлкі павялічыліся на 10,3% у параўнанні з такім жа мінулым перыядам. Паводле нядаўняга паведамлення Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў год на аднаго нашага суайчынніка ( з улікам немаўлят) прыпадае 15, 13 літра чыстага алкаголю. Гэта выводзіць нашу краіну ў дзесятак найгоршых па гэтым паказчыку ў свеце. Між тым, як сцвярджае вышэйназваная арганізацыя, ужыванне 8 літраў на душу насельніцтва – мяжа, за якой пачынаецца актыўная дэградацыя чалавечага патэнцыялу супольнасці. Вынікі ўжо ёсць – алкаголь летась забраў у краіне амаль 2,5 тысячы жыццяў.Чаму беларусы співаюцца катастрафічнымі тэмпамі? Сёння пра вар’яцкі кошт прадуктаў харчаваня не кажа толькі ляніві. Асабліва ў глыбінцы, дзе ўзровень жыцця адкаціўся да пачатку 90-х гадоў. Але тады за камуналку плацілі літаральна капейкі, а зараз усю палучку і пенсію з’ядаюць прадукты харчавання і выдаткі на жыллёва-камунальныя паслугі. І вось на гэтым фоне кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка і яго кішэнны урад выршылі парадаваць народ замарожваннем коштаў на гарэлку і моцныя спіртовыя напоі. Пакет соку або кілаграм фруктаў стаў удвая даражэйшы за бутэльку “бырла”. Для параўнання: за савецкім часам бутэлька гарэлкі каштавала 2 руб. 87 кап. Гэта было ў дваццаць разоў даражэй за бохан чорнага хлеба і амаль у два разы даражэй за кілаграм курыцы. Яшчэ ніколі алкаголь не быў такі танны, як на працягу апошніх 15 гадоў. У Швецыі адзін гандлёвы пункт, дзе можна набыць алкаголь, прыпадае на 23 тысячы насельніцтва, а ў Беларусі на 120 чалавек ! Проста татальная даступнасць таннага няякаснага алкаголю для шырокіх пластоў насельніцтва. Вось і атрымліваецца, што пасля дзвальвацыі рэжым штучна падтрымлівае алкаголікаў і п’яніц, каб кожны з іх без праблем і на “павер” мог заліць мазгі з раніцы вогненным зеллем. А што маюць нашы жанчыны? Паглядзіце на памер нашых пенсій, сацыяльных выплат, дапамог па выхаванню дзіцяці. Пры гэтым кожнай жанчыне хочацца яшчэ і добра выглядаць. Большасць беларусак не могуць выбраць: сядзець з дзецьмі або працаваць. Яны павінны рабіць усё, а гэта не кожная вытрымае. Цяжкасці жыцця, стрэсы, бязвер’е і адсутнасць свабоды. Панаванне начальнікаў-халуёў і хлусілівых “ідэолагаў”. Брудныя патокі хлусні з дзяржаўных сродкаў масавай прапаганды. Эміграцыя ў развітыя краіны таленавітых і працавітых. Параліч волі, ператварэнне асобы ў паслухмяную быдлоту. Як некалі казала расейская царыца Кацярына ІІ – “п’яным народам лягчэй кіраваць”. Каланізатары эфектыўна выкарыстоўвалі спірт разам са зброяй для вынішчэння карэнных народаў. Співаліся і сыходзілі з гістарычнай сцэны цэлыя плямёны і народнасці. Зараз пагроза навісла і над Беларуссю. Аднак успомнім культуру піцця сваіх прадзедаў. “Так, называў беларус гарэлку і чортавым стварэннем, і хваробай над хваробаю, і нават служкаю Смерці. Сама важнае, што доўгім часам трымалася культура піцця, і толькі адзінкі прадаваліся д’яблу карчмы. Сярэдні ж беларус падымаў пушчаную па крузе (адну!) чарку і мовіў да суседа: пакарай цябе, Божа, блінцом, да шчэ з маслам і піўцом”.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## КНІГА СКАРГАЎ

# Настаўнік з тапаром

Усё часцей паступаюць паведамленні з розных куткоў раёна пра тое, як супрацоўнікаў арганізацый і устаноў адпраўляюць то высякаць хмызнякі, то касіць траву. Да прыкладу, спецыялісты райветстанцыі выкарыстоўваліся ў якасці “шэфаў” – касілі траву на тэрыторы Лаўжанскага сельсавета, а настаўнікі Амбросавіцкай сярэдняй школы высякалі кустоўе у аддаленых вёсках. Заганная практыка прыцягнення супрацоўнікаў розных устаноўаў і прадпрыемстваў да пазапрофільнай фізічнай працы становіцца ўсё больш пашыранай ў нашым раёне. Насамрэч, гэта негатыўная з’ява да праграмы па навядзення парадку на зямлі не мае ніякага дачынення. Гэта ёсць спадчынай савецкай эпохі, гэтак званая “паказуха”, калі кожны мясцовы ўдзельны князёк з райвыканкама хоча выслужыцца перад вышэйшым кіраўніцтвам, або загадзя адрапартаваць пра датэрміновае выкананне планавых заданняў. Безумоўна, педагогі ці спецыялісты народнай гаспадаркі самі заслужылі такія адносіны з боку кіраўнікоў раёна. Калі не ўпэўнены ў сваёй кампэтэнтнасці, прафесіяналізме, дык тады хадзі ўсё лета з касой або з тапаром. А калі яшчэ пры гэтым існуе боязь запярэчыць начальству на недарэчныя загады, тады працуй бясплатна. Як бы там ні было, але наёмныя работнікі, як законапаслухмяныя грамадзяне павінны ведаць працоўнае заканадаўства. Ці законна тое, што кіраўнікі адпраўляюць сваіх работнікаў на розныя віды пазапрофільнай працы? Канешне, не. У артыкуле 20 Працоўнага кодэкса запісана, што наймальнік не мае права прыцягваць супрацоўнікаў да працаў, якія не прадугледжаны працоўнай дамовай. Адпраўляць прымусова, напрыклад, касіць траву – незаконна. Перавод на іншую працу дапушчальны толькі пры ліквідацыі аварыйных сітуацый або прадухіленне прастою на прадпрыемстве. Прымусова накіроўваць у сельсаветы або калгасы, канешне ж, незаконна. А што магчыма зрабіць супрацоўнікам, якія сутыкаюцца з такімі загадамі? Гэта працоўная спрэчка. Работнік можа звярнуцца ў камісію па працоўных спрэчках, якая павінна быць на прадпрыемствах. Наймальнік абавязаны стварыць такую камісію. А калі камісіі няма, можна звярнуцца ў суд або Дзяржаўную камісію па працы. Але па ўсяму відаць, пакуль што такіх смельчакоў у нашым раёне не знайшлося. Тады няхай інтэлігенты з вышэйшай адукацыяй махаюць тапарамі ў кустах забытых богам вёсачак.

**Аляксандр Шчамлёў.**

## ВЫРАШЫМ ПРАБЛЕМУ

# КАМПЕНСАВАЦЬ ЗАТРАТЫ НЕКАМУ

Сацыяльнае сіротства – злабадзённая праблема грамадства. Нягледзячы на дадатковыя меры па сацыяльнай абароне маламаёмасных грамадзян, у нашым раёне не скарачаецца колькасць дзяцей, якія страчваюць сувязь з біялагічнымі сем’ямі. Разам з тым не палепшылася сітуацыя з кампенсацыяй выдаткаў на ўтрыманне дзяцей сіламі абавязаных бацькоў. На апошнім пасяджэнні каардынацыйнага савета па выкананні Дэкрэта № 18 гаворка ішла аб выніках работы с абавязанымі асобамі. На сённяшні дзень у Шумілінскім раёне гэты кантынгент налічвае 123 чалавекі. Спецыялісты аддзела адукацыі былі вымушаны прызнаць, што сумы непалацяжоў растуць, а чатыры чалавекі ўжо значацца ў спісах хранічных неплацельшчыкаў. І сапраўды, нядбайныя бацькі кідаюць сваіх дзяцей, а мы, законапаслухмяныя грамадзяне, праз свае падаткі павінны ўтрымліваць чужых дзяцей. Зараз галоўная задача грамадства – не толькі запатрабаваць у нядбайных бацькоў грошы на ўтрыманне кінутых імі дзяцей, але і спыніць сацыяльнае сіротства. Каб вырашыць гэту праблему, былі праведзены прафілактычныя рэйды “Сям’я без насілля”. За першае паўгоддзе былі арганізаваны 23 рэйды, у якіх прынялі ўдзел работнікі міліцыі, супрацоўнікі райвыканкама, педагогі і медыкі. На пасяджэнні камісіі па справах непаўналетніх было запрошана сем сямей. Праверкі паказалі, што гора-бацькі, якія павінны плаціць дзяржаве за дзяцей, у асноўным уладкаваны на сельгаспрадпрыемствах, дзе атрымліваюць невялікія грошы, у сярэднім ад 300 да 500 тысяч рублёў. Між тым, утрыманне дзяцей у дзяржаўных установах падаражэла амаль на трэць. У сваю чаргу кіраўнікі арганізацый неахвотна прымаюць на працу абавязаных асобаў. Такія людзі часта запіваюць, парушаюць дысцыпліну і прагульваюць. Аднак замест звальнення іх усё ж давядзецца выхоўваць усімі сіламі. Найбольш цяжкіх адпраўляюць у лячэбна-працоўныя прафілакторыі. Але і тут пуцёвак на ўсіх не хапае – колькасць хронікаў, якія пакутуюць на алкагалізм у раёне таксама павялічваецца. Увогуле, як паказала практыка, установы адукацыі, сельскія выканаўчыя камітэты, часам паводзяць сябе нерашуча ў пытаннях накіравання матэрыялаў у камісію па справах непаўналетніх для адабрання дзяцей у бацькоў. А гэта можа выніку прывесці да цяжкіх наступстваў. Як бы там ні было, але Дэкрэт № 18 даўно не з’яўляецца эфектыўным рычагом уздзеяння на нядбайных бацькоў. Асабліва ва умовах эканамічнага крызісу, калі людзі з добрай адукацыяй і патрэбнай прафесіяй не могуць знайсці прыстойную працу ў раёне. Памер штомесячных абавязательстваў можа звязваць толькі заработная плата высокакваліфікаванага работніка. Абавязаная асоба амаль заўсёды не мае прафесіі (спецыяльнасці), вопыту работы і прафесійных навыкаў, таму, у адпаведнасці з працоўным заканадаўствам, не можа быць прынята на работу, якая патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі. У выніку маем тое, што маем – забытыя бацькамі дзеці па вялікаму рахунку знаходзяцца на ўтрыманні дзяржавы, а іх бацькі ўсё болей зацягнуты ў багну дэградацыі.

**Я. Вайтовіч.**

## “СВІТАНАК” У ІНТЭРНЭЦЕ

**Наша газета стала размяшчаецца на партале *http://kamunikat.org/*, дзе зацікаўленыя грамадзяне могуць яе спампаваць са старонкі: *http://kamunikat.org/svitanak.html*, што у каталагу “Пэрыёдыка” для далейшага выкарыстання яшчэ да з’яўлення газеты на паперы.**

## АБ’ЯВА

- ***Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бясплатную падпіску. Калі не жадаеце атрымліваць газету, то таксама патэлефануйце.***
- ***Рэдакцыя «Світанка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

## ЖЫВІ ЯК ГАСПАДАР

# Новы палігон для другаснай сыравіны

Спецыялісты Шумілінскай жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўжо не першы год выступаюць за адкрыццё новага палігона для цвёрдых бытавых адыходаў. Стары палігон, што размешчаны ля вёскі Гаравятка ўжо перапоўнены і становіцца небяспечным для навакольнага асяроддзя. Патрэбны больш сучасныя тэхналогіі: новае абсталяванне, памяшканні – усё гэта павінна быць наладжана для утылізацыіпапярэднераздзельна сабраных адыходаў. Але на жаль, ні рэальных прапановаў, ні грошай на гэты жыццёва неабходны праект пакуль што няма. За год кожны з нас пакідае ў сярэднім каля 300 кілаграмаў бытавога смецця. А для сучаснага чалавека адным з асноўных складнікаў камфортнага існавання з'яўляецца чысціня ўласнай прасторы. Калі б смецце наўпрост заставалася на вуліцы, дык маштабы экалагічнай катастрофы аказаліся непрадказальнымі. Менавіта таму і раз'язджаюць па дварах нашага райцэнтра кожны дзень дзве машыны аранжавага колеру – смеццявозы. Аднак па-ранейшаму на Шуміліншчыне пазбаўляюцца ад бытавых адыходаў самым дзедаўскім спосабам.Жыхары дамоў высыпаюць смецце ў кантэйнеры, а затым работнікі камунагаса вывозяць яго на палігон. Апроч палігона ў Гаравятцы на Шуміліншчыне існуе нямала і гэтак званых міні-палігонаў, якія замацаваны за кожным участкам жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Не сакрэт, што амаль каля кожнага населеннага пункта можна знайсці і несанкцыяніраваную звалку. Безумоўна, нельга бясконца пашыраць іх, каб пазбавіцца ад адыходаў жыццядзейнасці чалавека. І гэта тэхналогія, калі перапоўненыя кучы смецця ссоўвае бульдозер і засыпае пяском, робячы паслойную ізаляцыю – безнадзейна састарэла. Выхад бачны ў арганізацыі раздзельнага збору смецця і перапрацоўкі другаснай сыравіны. Ужо колькі год таму ў Шуміліне былі створаны для гэтага кантэйнерныя пляцоўкі. І кантэйнеры паставілі рознакаляровыя з адпаведнымі надпісамі. У сінія трэба класці шкло, у зялёныя паперу, у жоўтыя – пэт-бутэлькі, у карычневыя ці шэрыя – іншыя бытавыя адходы. Цяпер у раённай ЖКГ 190 такіх кантэйнераў. Для поўнага забяспячэння не хапае яшчэ сто. Аднак усё роўна, які сэнс у такіх кантэйнерах, калі спецыяльных машын няма, а людзей не хапае. Таму і ляцяць у кантэйнеры ўсё, што там не павінна быць: расліннасць з градак, старая тынкоўка, шпалеры, і г. д. Праўда, пластыкавыя бутэлькі шумілінцы прызвычаіліся кідаць асобна. Дарэчы, не кожны ведае адно немалаважнае правіла, што пэт-бутэлькі неабходна кідаць без накрывак, каб не перашкаджаць у далейшым прэсаванню пустой тары, не перавозіць паветра. Зараз на палігоне ля Гаравяткі працуюць рабочыя, якія займаюцца сарціроўкай: выбіраюць пластыкавыя бутэлькі і паперу. Пра сартавальныя смеццевыя лініі гаварыць не даводзіцца. Такая другасная сыравіна складзіруецца ў арачнік да лепшых часоў, а затым яе здаюць па дагаворам на прадпрыемствы. Да прыкладу, сёлета камунальнікам даведзены план на 20 тон паперы, 11 тон ужо здалі на Чашніцкую папяровую фабрыку "Чырвоная зорка". Апроч таго, нарыхтоўкамі другаснай сыравіны займаецца і Шумілінскае райспажыўтаварыства. За кілаграм макулатуры плацяць 150 рублёў, а за кілаграм металічнага лому даюць 980 рублёў. Насамрэч, акрамя піянераў ды бамжоў, гэтай справай сур'ёзна ніхто не займаецца. На тым жа Захадзе сістэма збору смецця і яго далейшай перапрацоўкі ўжо даўна наладжана на смеццеперапрацоўчых заводах і працуе на прыбытак, прычым значны. У нас жа гаворка ідзе толькі пра сур'ёзныя страты. Рана ці позна давядзецца рабіць рэкультывацыю міні-палігонаў, якія маюць асабліва непрывабны стан. А на правядзенне рэкультывацыі таксама неабходны пэўныя выдаткі. Укамунальнікаў на гэта не знойдзецца такіх матэрыяльных рэсурсаў. Хто будзе фінансаваць?

**Алесь Шумскі.**

## НАША СПАДЧЫНА

# ПРАВАСЛАЎНЫЯ ПАЛОМНІКІ

Група праваслаўных паломнікаў з суседняга Гарадоцкага раёна, сярод якіх было шмат дзяцей, наведала Шуміліншчыну. Паломніцтва прайшло па ўсяму нашаму раёну, госці спыняліся ля храмаў, сустракаліся са святарамі. Дырэктар праваслаўнага Духоўнага цэнтра Шумілінскага благачыння Вячаслаў Ільін прыймаў гасцей у Свята-Сергіеўскім храме, што ў Лескавічах. Гарадоцкім вернікам распавялі аб жыцці і дзейнасці Святога Мікалая Віцебскага, які нарадзіўся ў вёсцы Ужляціна і пачынаў сваю службу ў гэтым храме. Паломнікі даведаліся аб шумілінскіх святароў пра трагічную гісторыю храма ў Лескавічах. Затым іерэй царквы Шумілінскай акругі Фёдар Пучынскі адслужыў малебен за здароўе паломнікаў і кожнаму падарыў іконку. Праваслаўныя вернікі пабывалі на месцы былога замка пана Хлюдзінскага, дзе мелі магчымасць дакрануцца да яго зруйнаваных сценаў, адчуць жывую гісторыю таго месца, дзі калісьці жыла беларуская эліта. Пасля гарадоцкія госці адпачывалі ля возера Будавесць, дзе былі ў захапленні ад мясцовых краявідаў. Паход па шумілінскі край завершыўся ў вёсцы Пабеда, дзе стаіць Свята-Успенскі храм. Без сумневу, што падарожжа па Шуміліншчыне ўзбагаціла духоўнае жыццё праваслаўных вернікаў. Бо той, хто не цікавіцца гісторыяй і культурай сваіх знакамітых продкаў, рызыкуе назаўжды застацца манкуртам.

**Алесь Прыбярэжны.**

# ГАНАРОВАЯ МІСІЯ АД БОГА

Тры сястры міласэрднасці – Эмілія, Наталля, Ірына працуюць пры касцёле Божай маці Фацімскай. Яны дапамагаюць хворым, інвалідам, састарэлым і адзінокім людзям. Усяго яны абслугоўваюць каля паўсотні падапечных па ўсім раёне. А касцёл мае сувязі з Ордэнам "Дочкі міласэрднасці святога Вікенція де Поль", які дапамагае медыкаментамі і прадуктамі. Цяжка хворых ляжачых людзей даводзіцца наведваць кожны дзень. А гэта і жудасныя стогны, кроў – і абсалютная бездапаможнасць людзей у коме. Цяпер ад іх, сястрычак, іх мужнасці, хуткасці і спрыту рук залежыць жыццё чалавека. Яны заўсёды ў форме, стараюцца дапамагчы. І так дзень за днём, год за годам. І не важна, праваслаўны гэта, каталік ці атэіст – усе пацыенты для іх аднолькавыя, кожнаму надаецца належная ўвага. Акрамя догляду, з хворымі трэба пагаварыць аб набалелым, прачытаць малітву. Многія старыя людзі наша раёна вельмі ўдзячныя сёстрам-каталічкам за праяўленую да іх міласэрднасць. Яны выконваюць ганаровую місію ад Бога, увасабляюць у сябе вечныя хрысціянскія каштоўнасці. Такія чулыя і спагадлівыя людзі – рэдкія ў наш "прагматычны" час.

**С. Горкі.**

## КРЫМІНАЛ

# СКРАЎ КАБЕЛЬ

2 ліпеня ў 14 гадзін 30 хвілін ў Шумілінскі РАУС звярнуўся рабочы 1968 года нараджэння, жыхар горада Віцебска. Невядомыя злодзеі выставілі аконную раму і пранікі ў яго дачны домік. Быў скрадзены 50-ці метровы кабель, матэрыяльны ўрон склаў 120 тысяч рублёў. Следствам устаноўлена, што злачынства ўчыніў непрацуючы 1989 года нараджэння, жыхар вёскі Сураўні. Заведзена крымінальная справа па арт 205 ч. 2 КК.

## НАША ЭКАЛОГІЯ

# ЭКАЛАГІЧНАЕ СВЯТА НА ОБАЛЬШЧЫНЕ

Обальскае балота – унікальны і непаўторны прыродны комплекс. Нездарма яго называюць жамчужынай Паазер'я. Шумілінцы маюць рацыю, калі лічаць Обальскае балота сапраўдным скарбам нашага раёна. Можна надаць яму яшчэ дзесяткі такіх жа сакавітых і дасціпных характарыстык, бо наша балота іх заслугоўвае. Сёлетняе экалагічнае раённае свята пад назвай "Обальскае балота – жамчужына Паазер'я" прайшло з размахам. Святочныя мерапрыемствы адбываліся 24-25 чэрвеня на базе Обальскай сярэдняй школы. У якасці спонсара выступіла грамадскае аб'яднанне "Ахова птушак Бацькаўшчыны". На свята былі запрошаны школьнікі, прадстаўнікі абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, раённай улады, спецыялісты раённых экалагічных службаў і проста аматары прыроды. Першы дзень пачаўся з "круглага стала", удзельнікі якога абмяркоўвалі сучасны стан Обальскага балота і далейшыя перспектывы развіцця аграэкатурызма. Пры гэтым вядомы арнітолаг Уладзімір Іваноўскі выказаў надзею, што ў наступным годзе ўсё ж такі турысты завітаюць у шумілінскі край. Для гасцей ладзілі фэст. Найбольш спадабаўся гледачам тэатралізаваны канцэрт "Балотная завіруха". Затым школьнікі і настаўнікі ў якасці экскурсантаў даследвалі экалагічную сцежку даўжынёй у 6 кіламетраў. Галоўным кансультантам у распрацоўцы маршруту экалагічнай сцежкі выступіў дацэнт кафедры экалогіі і аховы прыроды ВДУ імя Машэрава Уладзімір Іваноўскі. Дарэчы, той жа Пётр Машэраў, імя якога дагэтуль носіць педагагічны універсітэт у Віцебску, у свой час загубіў непатрэбнай меліярацыяй цэлы водна-балотны край Паазерся, выклікаўшы экалагічную катастрофу. Ён запомніўся людзям гэтак званай барацьбой з "неперспектыўнымі вёскамі". Высахлі калодзежы, тысячы вёсак апусцелі начыста і пазіраюць сёння на нас чорнымі дзіркамі аконных гнілых праёмаў. Дзякуй богу, Обальскае балота зараз знаходзіцца пад міжнароднай праграмай ПРААН-ГЭФ па аднаўленні балотных комплексаў на Беларусі. У мінулым годзе на рэкультывацыі торфараспрацовак было выдзелена 60 тысяч еўра. Эксперт цэнтра экалагічных рашэнняў Яўген Лабанаў лічыць, што выкарыстанне торфу як энергетычнага рэсурсу менш выгадна, чым выкарыстанне экасістэмных паслуг непарушаных балот. Адабранне торфу са складу балот цягне за сабой радыкальныя змены экасістэмы. Акрамя таго, масавае спальванне торфу адмоўна ўплывае на атмасферу, пагаршае экалагічнае становішча на лакальным узроўні. Таму зусім не выпадкова быў выбраны маршрут экалагічнай сцежкі па былых торфараспрацоўках "Обаль-1". Цяпер удзельнікі свята могуць пабачыць пэўны працэс адраджэння балота, назіраць за птушкамі, жывёламі і раслінамі, якія занесены ў Чырвоную кнігу. Як адзначыў дырэктар Обальскай сярэдняй школы Аляксандр Штокін, балота з'яўляецца сховішчам мільёнаў крыніц і рачулак, гэта унікальны прыродны фільтр, які ачышчае ваду лепш за ўсе штучныя сістэмы. Акрамя гэтага, балота – гэта пітомнік лекавых раслін і запаведнік рэдкіх відаў флоры і фауны. Многа цікавага было ў гэты дзень: майстар-класы па лепцы птушак з гліны, які правёў чалец Саюза майстроў Беларусі Уладзімір Каласкоў, працу з паперай, дрэвам і саломкай прапаноўвалі кіраўнікі гурткоў Цэнтра пазашкольнай работы. У рамках сумеснага праекта "Ахова птушак Бацькаўшчыны", замежных таварыстваў і фондаў была прадстаўлена фотавыстава "Балота. Незвычайнае". Напрыканцы першага дня па існуючай традыцыі удзельнікі свята аддалі даніну павагі драўлянаму помніку, арлу-дзербніку – сімвалу Обальскага балота. На наступны дзень ва ўрочышчы вёскі Вішня адбыліся спаборніцтвы па кашэнні траў уручную, у якіх прынялі ўдзел прадстаўнікі прадпрыемстваў раёна. Лепшымі аказаліся касцы з райгазу. Сапраўдным упрыгожваннем свята стала парусная рэгата на возеры Расалай і водны маршрут па рацэ Абалянка па тэрыторыі Казьянскага заказніка. Асноўнай мэтай арганізатары свята лічаць кардынальную змену іміджа вадаёма пад назвай балота. Агульнапрынята лічыць, што балота – гэта багністае, гразкае і безжыццёвае месца. Для таго, каб перавадолець гэты стэрэатып, арганізатары свята і скіравалі свае высілкі. Цяпер асабліва актуальна асэнсаванне новага кантэксту жыцця на балоце для арганізацыі экалагічнага турызму.

**Алесь Прыбярэжны.**

## У ЦЭНТРЫ УВАГІ

# ВЫСЛУХАЦЬ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА

**Штодзённыя праблемы вясковых людзей павінны вырашаца на той тэрыторыі, дзе яны ўзнікаюць. Вось чым у першую чаргу трэба займацца прадстаўнікам мясцовай улады.**

Прычым большасць пытанняў, з якімі звяртаецца насельніцтва да ўлады, пераважна сацыяльнага характару. Як паказвае практыка, амаль усе яны вырашальныя. Галоўнае – не адмахвацца ад таго, з чым звяртаюцца да чыноўнікаў людзі, жыць іх клопатамі. Уважліва выслухаць кожнага чалавека, які прыйшоў за дапамогай, і вырашыць яго праблему, калі ёсць магчымасць. Калі ж не атрымліваецца зрабіць, дык тактоўна і даходліва растлумачыць – чаму. Але гэта – ідэальны варыянт. У рэальнасці ўсё намнога больш складана і неадназначна. Як працуюць з насельніцтвам шумілінскія ўлады можна разгледзець на прыкладзе Лаўжанскага сельсавета. 12 ліпеня тут прайшло гэтак званая выязная сустрэча з насельніцтвам. Пры гэтым дэлегацыя з чатырох груп супрацоўнікаў райвыканкама за адзін дзень аб'ехала 30 вёсак і населеных пунктаў, размешчаных на тэрыторыі сельсавета. Раённыя візіцёры завіталі ў старэючыя вёскі ў Бываліна, Залужжа, Юрава, Ласвіцкія, Добрына. У гэтых маленькіх вёсачках пражываюць у асноўным пенсіянеры, якія ўсё сваё жыццё аддалі калгасам, працуючы на палях і фермах. Аднак большасць пенсіянераў па-ранейшаму не спяшаюцца адпачываць – на сваіх сотках вырошчваюць бульбу, пшаніцу і ячмень. Тэхнікі ў іх няма – адсюль і праблемы. Старыя з вёскі Залужжа паскардзіліся намесніку старшыні райвыканкама Анатолю Зайцаву на тое, што цэны на выпіску тэхнікі мясцовай сельгасгаспадаркі сёлета "касмічныя". У сваю чаргу Зайцаў параіў пенсіянерам здаць свае соткі ў агульны севазварот. Вялікую плошчу ўбраць значна лягчэй, чым ганяць дарагі камбайн па прыватных агародах. Неаднойчы людзі наракалі на калгасных пастухоў: зусім дрэнна глядзяць кароў і цёлак, допускаюць патраву агародаў. Дзе на іх знайсці управу? А тут яшчэ камунгас "адрамантаваў" калонку: прыехалі, разабралі і… кінулі. Прынамсі, самая вялікая незадаволенасць вяскоўцаў была на работу аўталаўкі: асартымент сціплы, у асноўным хлеб ды віно. Шмат якія прадукты былі пратэрмінаваныя, некаторыя людзі нават атруціліся і трапілі ў шпіталь. І зноў такі, не ведаюць каму скардзіцца, чакаюць, каб высокае начальства прыехала да іх само, разабралася, знайшло вінаватых і пакарала. У цэнтральнай вёсцы Добрына наогул, набалелыя праблемы накаціліся, як снежны камяк. Малако па выхадным дням не збіраюць, вуліца Першамайская ўся ў калдобінах, да Лаўжанскай амбулаторыі нязручна дабірацца, служба быту не працуе. У кагосці на двары дагэтуль не спілавалі аварыйнае дрэва, некага раздражняюць руіны нядаўна знесеных струхлелых дамоў, а камусці не ў магазіне не даюць спіртное "на павер" па запісу ў сшытак. І гэта апошняя сустрэча шумілінскіх чыноўнікаў з насельніцтвам Лаўжанскага сельсавета паказала, што нашы людзі пакуль што не праяўляюць актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці. Запалоханыя мясцовым начальствам, раз'яднаныя дробязнымі прыватнымі інтарэсамі, яны самі не хочуць пісаць заявы ў камунгас, райвыканкам або ў суд на дзеянні нядобрасумленных адказных асоб. Сядзяць і чакаюць, пакуль да іх само прыедзе начальства з больш высокай інстанцыі, разбярэцца, знойдзе вінаватых і пакарае. Але ці вырашыць яно застарэлыя праблемы?

**Алесь Шумскі.**

ГАЛОЎНАЯ ПАДЗЕЯ

# ТЕАТР АБСУРДА

**АКЦИИ МОЛЧАЛИВЫХ В РАМКАХ КАМПАНИИ «РЕВОЛЮЦИЯ ЧЕРЕЗ СОЦИАЛЬНЫЕ СЕТИ» И ИХ БРУТАЛЬНЫЙ РАЗГОН ВЛАСТЯМИ САМИ ПО СЕБЕ СТАЛИ БЕСПРЕЦЕДЕНТНЫМИ СОБЫТИЯМИ В БОГАТОЙ НА ПРОТЕСТЫ И РЕПРЕССИИ СОВРЕМЕННОЙ ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ. НИКОГДА ТАКОГО НЕ БЫЛО, ЧТОБЫ ЗА ТРИ НЕДЕЛИ В СТРАНЕ БЫЛО ЗАДЕРЖАНО 1730 ЧЕЛОВЕК. ДАЖЕ ПОСЛЕ 19 ДЕКАБРЯ АРЕСТОВАННЫХ БЫЛО МЕНЬШЕ.**

Еще один рекорд: за это время милиция и спецслужбы задержали 73 журналиста. Никогда в Беларуси не было такой целенаправленной охоты на представителей СМИ. Причем, брутальность действий властей с каждой новой средой нарастает.

Эти акции и общенациональный «хапун» выявили, вытащили на поверхность и иные любопытные общественно-политические процессы, которые прежде были скрыты или так не проявлялись. Впервые масса людей задерживалась с таким грубым нарушением законов и права. Граждане подвергались штрафам, административному аресту за то, что они либо молча стояли, ходили по улицам и площадям, либо аплодировали. В Минске человека судили на основании постановления о привлечении к ответственности, в котором было написано: «хлопал в ладоши».

Обратите внимание, как власти тщательно пытаются скрыть от общества, в чем же состоит вина участников акции. Вот А. Лукашенко, выступая на торжественном собрании накануне Дня независимости и стремясь дискредитировать своих оппонентов в глазах населения, говорил: «Топаньем, хлопаньем, мычанием, рычанием на площадях, на улицах проблем не решишь». На самом деле никто не топал, не мычал, и не рычал.

Однако модель ненасильственного сопротивления, которую взяли на вооружение организаторы молчаливых акций, может перевернуть отношение общества к оппонентам власти. Не случайно гвоздем всей политической кампании властей против оппозиции после 19 декабря стали кадры битья дверей Дома правительства. Дескать, вот наглядное свидетельство насилия противников президента в отношении государственного учреждения. На этом были построены и судебные процессы, и их пропагандистское обеспечение. Надо сказать, эта кампания дала определенный эффект. Опросы НИСЭПИ показывают, что в первые месяцы после этих событий около половины населения осуждала действия сторонников оппозиции 19 декабря.



Сейчас ситуация иная. Молчаливые акции происходят в момент резкого роста недоверия к власти, недовольства, обозленности людей. И в этой атмосфере массовый «хапун» по отношению к людям, которые просто стоят, молчат или аплодируют, скорее всего, вызовет сочувствие обывателей. Живущее в глубине души белорусов чувство справедливости по отношению к невинным жертвам милицейского произвола может еще усилить и без того негативный образ властей. Что чревато самыми непредсказуемыми последствиями. Ибо, как известно, революции подготавливаются моральным неприятием существующей власти, непременное условие краха любого политического режима — нравственная изоляция.

